2. Минская область в документах и материалах. Выпуск 1. Начало. Январь 1938 г. – 1941 г. – Минск, 2007.
3. Накануне. Западный особый военный округ (конец 1939 г. – 1941 г.). Документы и материалы. – Минск, 2007.
4. Гісторыя Беларусі (1917 – 1945) / П.І. Зялінскі і інш. – Мінск, 2012.
5. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А.А. Коваленя и др. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – 544 с.

УДК 94(476)

С. Я. Новікаў

# АБАРОНЧЫЯ БАІ Ў БЕЛАРУСІ ЛЕТАМ 1941 ГОДА Ў АДЛЮСТРАВАННІ НОВЫХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ

Абарончыя баі Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. не застаюцца па-за ўвагай сучаснай расійскай і беларускай гістарычнай навукі [1; 2; 3; 4]. Аднак пасля знаёмства з некаторымі новымі працамі ўзнікае шэраг прынцыповых пытанняў, сярод якіх адным з першым з’яўляецца вызначэнне ступені карэляцыі гістарыяграфічных фактаў і дакументальных крыніц аб гісторыі баявых дзеянняў у Беларусі ў першыя два месяцы Вялікай Айчыннай вайны.

Разгледзім толькі некалькі тэзісаў з новага 12-томнага расійскага выдання, заключны том якога выйшаў напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі [5]. Звернемся да зместу 2-га тома гэтага выдання, у якім разглядаецца пачатковы перыяд вайны, у тым ліку, адлюстраваны падзеі ў Беларусі летам 1941 г., і прапануем пазнаёміцца з новымі вынікамі іх навуковага аналізу на аснове выкарыстання метаду гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі [2].

Прааналізуем некаторыя з іх на прыкладзе абарончых баёў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Так, на стар. 736 2-га тома чытаем наступны тэзіс: «На 22 июня 1941 г. Брестскую крепость защищали порядка 3,5 тыс. человек 6-й и 42-й стрелковых дивизий 28-го стрелкового корпуса РККА» [2, с. 736]. Заўважым, што гэты тэзіс фігураваў у савецкай гістарыяграфіі абароны Брэсц-

кай крэпасці, сустракаецца ён і ў сучасных беларускіх навуковых працах [6, с. 17; 7, с. 110–111; 8, с. 95 – 97; 9, с. 62].

Аднак гэтыя лічбы ў пачатку 2000-х гг. не прымае на павер расійскі даследчык Р.В. Аліеў – аўтар дакументальных прац “Штурм Брестской крепости” і “Брестская крепость: Документы и воспоминания” [10; 11]. У іх гісторык адыходзіць ад савецкай гістарыяграфічнай лічбы, якая не адпавядае гістарычнай рэчаіснасці па прычыне таго, што на момант заканчэння нямецкага штурму крэпасці ў нямецкім палоне апынулася звыш 7 тыс. абаронцаў крэпасці і чырвонаармейцаў. Да такой высновы расійскі даследчык прыходзіць пасля вывучэння нямецкіх крыніц, сярод якіх “Данясення камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі аб узяцці Брэст–Літоўска” ад 8.07.41 г. [11, с. 390]. Асобна адзначым, што згаданыя вышэй выданні расійскага гісторыка пабачылі свет у вядомых маскоўскіх выдавецтвах “Яўза”, “Эксмо” і “Вече”, аднак пра іх не згадваецца ў спісе літаратуры да 2-га тома новага расійскага выдання. Узнікае пытанне, па якіх прычынах у грунтоўным выданні не згадваецца ці навукова не аспрэчваецца тэзіс Р.В. Аліева ў дачыненні да агульнай колькасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці, лічба якіх толькі на Цэнтральным умацаванні складала каля 9 тыс. чалавек на момант пачатку нямецкага штурму 22 чэрвеня 1941 г. [10, с. 238]. Прычын таго, чаму гэтых звестак чытач не знойдзе на старонках новага выдання, знайсці аўтару гэтых радкоў таксама не ўдалося. Пры гэтым Рэдакцыйная камісія новага расійскага выдання пераконвае чытачоў у тым, што пры напісанні працы аўтары “абапіраліся не на ідэалагічныя пастулаты, а на папярэднія навуковыя даследаванні з улікам новых метадалагічных падыходаў і з шырокім выкарыстаннем вялікага масіву архіўных дакументаў [1, с. 9]. Таму застаецца пытанне, чаму ж у пералік “папярэдніх навуковых даследаванняў” не трапілі больш за 1000-старонкавыя працы расійскага гісторыка, напісаная на аснове выкарыстання значнага масіву як савецкіх, так і нямецкіх дакументаў.

На стар. 736 чытаем наступнае сцвярджэнне расійскіх аўтараў: “К началу июля противнику удалось захватить укрепления на Центральном острове после особенно масштабной бомбардировки и артиллерийского обстрела”. Адразу ж узнікае пытанне, чым гэта сцвярджэнне адрозніваецца ад тэзіса аб тым, што “29 – 30 июня фашисты предприняли «генеральный штурм» Цитадели, в результате которого им удалось занять большую часть укреплений и

нанести ее гарнизону тяжелые потери”, апублікаванага ў пачатку 1960-х гадоў у 6-томнай «Истории Великой Отечественной войны Советского Союза 1941 – 1945 гг.» (М., 1961. – Т. 2, с. 19). У дасведчанага чытача, асабліва студэнцкай моладзі, якая добра ведае змест фільма расійскага рэжысёра А. Кота “Бресткая крепость” (2010), узнікаюць і іншыя лагічныя пытанні, у тым ліку аб абароне Цытадэлі. Да таго ж неабходна ўлічваць і той факт, што беларускаму чытачу дзякуючы новым выданням таксама вядомы дакладныя факты з гісторыі нямецкага штурму крэпасці, калі да 29 чэрвеня самалёты люфтвафэ не ўдзельнічалі [12; 13; 13; 14; 15; 12, с. 152]. Са згаданага тэзіса вынікае, што “Цэнтральны востраў”, які з часоў стварэння крэпасці насіў назву “Цэнтральнага ўмацавання” ці “Цытадэлі”, паколькі геаграфічна знаходзіўся ў самым “сэрцы крэпасці Брэст–Літоўск” [12, с. 174], перанёс асабліва моцную бамбардзіроўку. Нагадаем, што з захаду, поўначы і поўдня Цытадэль прыкрывалі іншыя ўмацаванні – адпаведна Цярэспальскае, Кобрынскае і Валынскае. З айчыннай гістарыяграфіі таксама вядома, што апошнім днём арганізаванай абароны ўмацаванняў на Цэнтральным востраве з’яўляўся 26 чэрвеня [10, с. 657].

Пра гэта пішуць не толькі беларускія даследчыкі. Гэты ж факт гучыць на старонках і нямецкіх прац, у якіх сцвярджаецца, што самыя цяжкія баі з боку штурмуючых вяліся на працягу трох першых дзён, потым на працягу двух дзён ішлі баі ў асобных ачагах супраціўлення на Цэнтральным востраве (ўмацаванні) ці Цытадэлі. А пасля 26 чэрвеня баі працягваліся толькі за Ўсходні форт, абаронцы якога пасля двух моцных авіяўдараў здаліся ў палон вечарам 29 чэрвеня. Як адзначае К. Ганцар, пасля 26 чэрвеня больш не гінулі ваеннаслужачыя 45-й пяхотнай дывізіі, якая на працягу пяці дзён штурмавала цэнтральныя ўмацаванні крэпасці [16, с. 144]. Вядома, што апошнім непрыступным рубяжом, на які абрынулася не толькі артылерыя, але і нямецкая авіяцыя, з’ўлялася Кобрынскае ўмацаванне, дзе трымаўся Ўсходні форт на чале з будучым Героем Савецкага Саюза камандзірам 44-га стралковага палка маёрам П.М. Гаўрылавым. Узнікае заканамернае пытанне, а чаму гэтага не ведаюць пасля таго, як легендарны камандзір і мужны абаронца Ўсходняга форту напісаў успаміны “Крепость сражается”, якія ў 1970-я гады вытрымалі два выданні, дзе дэталёва паказаў штодзённыя падзеі сваёй эпапеі самаадданай барацьбы, упартага выжывання і валявой перамогі.

Застаюцца адкрытымі і іншыя пытанні, напрыклад, аб храналогіі рэальных падзей, храналагічных рамках актыўнай абароны крэпасці Брэст–Літоўск, фактычнай колькасці абаронцаў з савецкага боку, а таксама аб колькасці савецкіх воінаў, якія да канца чэрвеня з тэрыторыі крэпасці і горада патрапілі ў нямецкі палон. Лёс 7223 палоненых радавых, сяржантаў і афіцэраў Чырвонай арміі пасля шматлікіх заклікаў і зваротаў навуковай грамадскасці, у тым ліку аўтара гэтых радкоў, быў у рэшце рэшт ушанаваны ў экспазіцыі, адкрытай у Паўночна-ўсходняй казарме Цытадэлі Брэсцкай крэпасці ў 2014 г. і адзначанай спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 г. [17, с. 29; 18, с. 2].

Новым у айчыннай гістарыяграфіі пры даследаванні баявых падзей на Дняпроўскім рубяжы пад Магілёвам летам 1941 г. з'яўляюцца гістарычныя ацэнкі, якія вынікаюць з нямецкіх дакументальных крыніц, напрыклад: Магілёўская бітва! Бастыён на Дняпры! Крэпасць-Магілёў! Кожнае з іх мае дакументальнае пацверджанне і сведчыць пра тое, што пад Магілёвам войскі германскага вермахта не здолелі адразу ўзяць умацаваны абарончы рубеж Чырвонай арміі, а вымушаны былі падцягваць новыя сілы, у тым ліку выкарыстоўваць палявыя падраздзяленні з рэзерву сухапутных войск вермахта. Паводле нямецкіх дакументаў, пад Магілёвам размова ідзе не аб звычайнай абароне, а аб унікальнай абарончай аперацыі, фактычна першай удала арганізаванай без дырэктыў зверху і па-майстэрску праведзенай у неверагодна складаных умовах абарончай бітве, якую высока ацаніла камандаванне 7-га армейскага пяхотнага корпуса [19, с. 182]. З нямецкіх дакументаў вынікае, што абарону Магілёўскага плацдарма вялі не толькі дзве штатных дывізіі (110-я і 172-я), якія раней не былі задзейнічаны ў баявых дзеяннях, але і тры выматаныя, між тым баяздольныя дывізіі (148-я, 161-я і 210-я матарызаваныя), а таксама рэшткі 24-й, 50-й, 100-й стралковых і іншых дывізій [20, с. 52]. Дзякуючы звесткам з нямецкіх дакументаў удаецца ўпершыню ўнесці істотныя ўдакладненні ў колькасныя даныя аб савецкіх ваеннапалонных, лічба якіх пад Магілёвам пераўзыходзіла 35 тыс. чалавек [19, с. 181]. Зразумела, што звесткі, выяўленыя ў нямецкіх дакументальных крыніцах, патрабуюць узважанага аналізу, крытычнага падыходу і грунтоўнага вывучэння.

У пераліку пытанняў, якія чакаюць айчынных гісторыкаў, адным з самых важных можна вылучыць гісторыю баявых дзеянняў аба-

ронцаў магілёўскага плацдарму, якую забяспечвала 172-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М.Ц. Раманава. Паводле новых дакументаў, загад на абарону Магілёва для трох стралковых палкоў, а таксама падраздзяленняў артылерыйскага забеспячэння і іншых падпарадкаваных яму часцей быў упершыню аддадзены ў 20.30 толькі 7 ліпеня 1941 г. [21, с. 15]. У гэтым плане неабходна прытрымлівацца і новых дакументальных даных, якія вынікаюць з нямецкіх дакументаў у дачыненні да баявых дзеянняў, якія мелі месца 12 ліпеня ў ходзе наступлення ў складзе трох рот толькі аднаго нямецкага батальёна на рубяжы баявой абароны 388-га стралковага палка 172-й стралковай дывізіі на ўчастку ад в. Туманаўка да в. Буйнічы і інш.

Сказаць суровую праўду пра баявыя падзеі пад Магілёвам вымагаюць новыя дакументы, у тым ліку нямецкія. Так, у данясенні 7-га нямецкага пяхотнага корпуса па выніках штурму ўмацаванага плацдарма на Дняпры, камандаванне корпуса не толькі дае прынцыповы аналіз аператыўных дзеянняў 7-й, 15-й, 23-й і 78-й пяхотных дывізій, фіксуючы пры гэтым упартую барацьбу, якую яны вымушаны былі весці на кожным з рубяжоў абароны Магілёўскага плацдарма, але і адзначае асаблівую вытрымку, стойкасць і вынослівасць абаронцаў дняпроўскага рубяжа пад Магілёвам. Звернемся да асобных радкоў нямецкага дакумента, з якога вынікае: "Плацдарм Магілёў браўся 7-м армейскім корпусам на працягу сямі дзён з нечакана жорсткімі баямі. Гэты штурм уяўляе сабой цалкам завершаную аперацыю, а таму з'яўляецца рэдкай карцінай **асобнай бітвы** (выдзелена аўтарам. – С.Н.) армейскага корпуса… Рускі трымаецца да апошняга. Ён зусім не ўспрымальны да баявых дзеянняў на яго флангах і ў тыле. Трэба было з боем браць кожную стралковую ячэйку, кожную процітанкавую і кулямётную пазіцыю, кожны дом" [3, с. 181].

Гістарычныя дэфініцыі, якія вынікаюць з новых дакументальных крыніц і сведчаць аб існаванні "непрыступнага бастыёна" на Дняпры, баяздольнай "крэпасці Магілёў" і правядзенні летам 1941 г. "Магілёўскай бітвы", з'яўляюцца для беларускай грамадскасці пераканаўчай падставай для таго, каб год юбілею Вялікай Перамогі стаў для нашчадкаў гераічнай абароны і ўсяго беларускага народа сапраўдным момантам ісціны, адметнай вяхой гістарычнай памяці, назаўсёды ўпісанай у нацыянальны летапіс гісторыі прысваеннем Магілёву ганаровага звання "Горад-герой"!

Па-новаму нам неабходна ацэньваць і баявыя дзеянні, якія адбыліся на Гомельшчыне летам 1941 г. Выяўленне ў нямецкіх дакументах новых гістарычных фактаў прыводзіць да высновы, што пакуль застаюцца “белыя плямы” і ў вывучэнні абароны Жлобіна, Рагачова і Гомеля. Параўнанне выяўленых дакументальных звестак з ужо замацаванымі ў айчыннай гістарыяграфіі паказвае, што гісторыкам неабходна рашуча рухацца наперад у стварэнні цэласнай карціны гістарычных падзей з улікам як новых дакументальных крыніц, так і крытычнага аналізу традыцыйных падыходаў. У такой сітуацыі мэтай будзе з’яўляцца не выстаўленне нейкіх ацэнак, а вызначэнне навуковай верагоднасці фактаў у традыцыйнай гістарыяграфіі, характарыстыка глыбіні выкарыстання дакументальных крыніц і паўнаты ўвядзення ў сучасную беларускую гістарычную навуку новых азначэнняў, ацэнак і высноў у дачыненні да летняй франтавой наступальнай аперацыі на Гомельшчыне падраздзяленнямі Чырвонай арміі Цэнтральнага фронту, зусім невыпадкова створанага пад такой назвай у канцы ліпеня 1941 г. Пры ўсім гэтым асабліва важна мець на ўвазе наступны гістарычных факт. Упартыя баявыя дзеянні савецкіх сілаў у ходзе франтавых контрудараў, праведзеных на тэрыторыі Беларусі, у значнай меры сталі фактычна прычынай таго, што А. Гітлер 30 ліпеня 1941 г. падпісвае дырэктыву № 34, якой упершыню аддае загад аб пераходзе групы армій “Цэнтр” да абароны. Што азначае нішто іншае як пачатак фактычнага краху плана германскага “бліцкрыгу” на ўсходзе [4, с. 117].

Падкрэслім, што гісторыя баявых дзеянняў на беларускай зямлі летам 1941 г. патрабуе удумлівага даследавання на сучасным узроўні гістарычных ведаў. Публікацыя новых нямецкіх і ўвядзенне малавядомых айчынных дакументаў пераконвае аўтара ў тым, што адказы на многія пытанні становяцца не такімі відавочнымі, як былі раней. Галоўнай задачай цяпер бачыцца навуковая рэканструкцыя гісторыі Гомельскай бітвы – той бітвы, значэнне якой пакуль не вызначана ў айчыннай гістарыяграфіі. Менавіта на Гомельшчыне Чырвоная армія здабыла адзін з першых стратэгічных поспехаў. Галоўным вынікам бітвы было выключэнне сіл 2-й нямецкая арміі і 2-й танкавай групы з баёў на маскоўскім напрамку. Замест таго, каб выкарыстоўваць гэтыя баявыя сілы для разгрому савецкіх войскаў пад Смаленскам, камандаванне вермахта было вымушана перавесці іх далёка ў тыл групы армій “Цэнтр”. Наступальныя і абарончыя аперацыі Чырвонай арміі разбуралі яго планы на рубя-

жах па рэках Бярэзіна, Днепр і Сож. Чырвонаармейцы затрымлівалі нямецкія часці, наносілі значныя страты і разбуралі планы аб імклівым наступленні на маскоўскім напрамку. Нягледзячы на неспрыяльную абстаноўку, савецкім баявым часцям у выніку ўпартых і кровапралітных баёў удалося аказаць сур’ёзнае супраціўленне праціўніку, затрымаць рух войскаў на ўсход і прымусіць іх часова спыніцца і нават перайсці да абароны [4, с. 117].

Такім чынам, гісторыя баявых дзеянняў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., адлюстраваных у новых працах, ставіць у парадак дня патрабаванні па далейшым вывучэнні і пошуку праўдзівых адказаў на ўзнікшыя прынцыповыя пытанні. З улікам гэтага неабходна працягнуць навуковы аналіз гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на аснове крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай кампаратывістыкі.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ


1. Великая Отечественная война 1941 – 1945 годов. В 12 т. Т. 1. Основные события войны. – М.: Воениздат, 2011. – 848 с.
2. Великая Отечественная война 1941 – 1945 годов. В 12 т. Т. 2. Происхождение и начало войны. – М.: Кучково поле, 2012. – 1008 с.
3. Новікаў, С.Я. Беларусь улетку 19441 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С.Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2014. – 300 с.
4. Новікаў, С.Я. Беларусь улетку 19441 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С.Я. Новікаў. 2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае. – Смаленск, 2015. – 436 с.
5. Рубцов Ю. К 70-летию Великой Победы. В России издана 12-томная история Великой Отечественной войны / Ю. Рубцов. [Электронны рэсурс]. – 2015. – Рэжым доступу: http://www.fondsk.ru/news/2015/04/02/k-70-letiu-pobedy-izdana-12-tomnaja-istoria-velikoj-otechestvennoj-vojny-32547.html. – Дата доступу: 15.04.2015.
6. Героическая оборона. – 2-е изд, доп. – Минск: Изд–во Госиздат БССР, 1963. – 598 с.
7. Брестская крепость // Великая Отечественная война 1941 – 1945: энциклопедия / Редколлегия: Ю.Я. Барабаш, П.А. Жилин (зам. гл. ред.), В.И. Канатов (отв. секретарь) [и др.]. – М.: Сов. энциклопедия, 1985. – С. 110 – 111.

8. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945: энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1990. – С. 95 – 97.

9. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А.А. Коваленя (рук. автор. кол-ва), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко и др. – Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.

10. Алиев, Р.В. Штурм Брестской крепости / Р.В. Алиев. – М.: Яуза; Эксмо, 2008. – 800 с.

11. Алиев Р.В. Брестская крепость. Документы и воспоминания / Р.В. Алиев. – М.: Вече. – 2010. – 448 с.

12. Бресткая крепость. Война и мир / автор концепции и текста А. Суворов. – Брест: Полиграфика, 2010. – 256 с.

13. Данясенне аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст–Літоўска // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 93 – 97.

14. Новікаў, С.Я. Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў / С.Я. Новікаў // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 88–92.

15. Алиев, Р.В. Брест. Июнь. Крепость. В 2 кн. Кн. 1 / Р. Алиев, И. Рыжов. – Брест: Полиграфика, 2012. – 272 с.

16. Ганцэр, К. Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць / К. Ганцэр. – ARCHE. – 2014. – № 5. – С. 135 – 153.

17. Новікаў, С.Я. Абарона Брэсцкай крэпасці: гістарыяграфічныя міфы і гістарычная рэальнасць / С.Я. Новікаў // Историческое наследие 1941 года в исследованиях и экспозициях музеев. Материалы Международной научной конференции, посвященной 70-летию обороны Брестской крепости (Брест, 9 – 11 июня 2011 г.). – Брест: Альтернатива, 2013. – С. 22 – 29.

18. Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года // СБ. Беларусь сегодня. – 2015. – 3 января.

19. Данясенне 7-га армейскага корпуса аб узяцці ўмацаванага плацдарма Магілёў (20.7–26.7.41г.) // Новікаў С.Я. Беларусь улетку 1941 года…, С. 174–182.

20. Новікаў, С.Я. Абарона Магілёва (20 – 26 ліпеня 1941 г.) у святле новых дакументальных крыніц / С.Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 7. – С. 44 – 53.

21.Новікаў, С.Я. Абарона Магілёва 1941 года: новыя звесткі / С.Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 7. – С. 12 – 16.